## Мінулае — дзеля будучыні

**Насамрэч, калі б Беларускі фонд культуры вёў толькі адну праграму, гэта ўжо была б вялікая праца. Але за дзесяцігоддзе існавання было шмат праектаў, дзякуючы якім нашы суграмадзяне даведаліся пра сваю краіну больш, а краязнаўства стала не толькі папулярнай тэмай, але і часткай жыцця асабліва зацікаўленых асоб — краязнаўцаў. І ўсё ж застаюцца яшчэ задачы, якія нам — і Беларускаму фонду культуры — вырашаць далей.**

Дзякуючы дзейнасці Беларускага фонду культуры ўжо больш за 20 гадоў працуе праграма «Вяртанне нацыянальных каштоўнасцей». Найперш яе задачай было вызначэнне матэрыяльных каштоўнасцей Беларусі, якія пакінулі нашу краіну па розных прычынах і не вернутыя дагэтуль.

Гэтай тэме прысвечана восем тамоў кнігі «Вяртанне», выдадзенай з удзелам БФК. Гэта падрабязны навуковы аналіз страчанай спадчыны ад музейных спісаў і да выступаў спецыялістаў па тэме гісторыі пэўных экспанатаў і культурных каштоўнасцей. З’явіўся гэты праект у тым ліку дзякуючы вялікаму рупліўцу, прафесару Адаму Мальдзісу.

— Нас заўсёды пытаюць: а што ж нам удалося вярнуць? На гэта пытанне альбо вельмі складаны адказ, альбо адказу няма. Бо вярнуць вельмі няпроста. Напрыклад, з Луўра спрабавалі вярнуць свае культурныя каштоўнасці Егіпет, Турцыя, Грэцыя, але пакуль што нічога не атрымалася, — распавёў старшыня рады Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп. — Але ў нас іншая сітуацыя: ёсць каштоўнасці, якія вывезены ў законным парадку. У 1951 годзе польскі ўрад звярнуўся да урада БССР, каб вярнулі сто партрэтаў Радзівілаў. ЦК КПСС даў вырашыць гэтае пытанне народу, а беларусы, абсалютна не заявіўшы спробы даказаць, што Радзівілы — гэта нашы, а не польскія магнаты, вярнулі «польскія партрэты» Радзівілаў у Варшаву.

І гэта зусім не выключная гісторыя. Падобнае адбывалася ў нашай краіне цягам дзесяцігоддзяў, калі беларускі народ быў адлучаны ад свайго мінулага. Разам з гэтым шмат нашай спадчыны было вывезена незаконным шляхам ці эвакуіравана і не вернута. Такая гістарычная рэліквія, як крыж Ефрасінні Полацкай майстра Лазара Богшы, да Вялікай Айчыннай вайны была ў экспазіцыі магілёўскага музея. Наогул, фонды беларускіх музеяў да Вялікай Айчыннай вайны былі значна багацейшыя. Напрыклад, у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі былі шэраг работ Юдэля Пэна, а таксама калекцыя заходнееўрапейскага жывапісу — творы мастакоў фламандскай і італьянскай школ сямнаццатага стагоддзя і інш. А ў Баранавічах беларусы маглі пабачыць арыгіналы Рэмбранта і Тэадора Жэрыко.

— Зараз вярнуць тыя ж партрэты Радзівілаў мы не маем магчымасці. І вымушаны рабіць копіі, спадзявацца на падарункі. Дзякуй, што ёсць людзі, якія спрыяюць гэтаму, у тым ліку ў Міністэрстве культуры Польшчы, грамадскія арганізацыі дапамагаюць, і нешта нам удаецца вярнуць. А ўсё астатняе калі і вяртаецца, то дзякуючы сродкам, якія мы ўкладваем, — адзначыў старшыня рады БФК.

Нягледзячы на тое, што Камісія пры Савеце Міністраў па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі, працуе ўжо каля васьмі год, намеснік міністра культуры Васіль Чэрнік указаў на тое, што ў нас адсутнічаюць законы аб рэстытуцыі каштоўнасцей.

— У Рэспубліцы Беларусь адсутнічаюць нарматыўныя акты аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей. Гэта вельмі вялікая праблема для нас сёння, — адзначыў Васіль Чэрнік. — Я думаю, што камісія ў абноўленым складзе, якая павінна ўжо зараз збірацца і працаваць, мае шмат правоў, каб паставіць пытанне пра распрацоўку такога закона.

Разам з гэтым савет Беларускага фонду культуры ўздымаў шэраг пытанняў, да якіх трэба прыцягваць увагу. Анатоль Бутэвіч, намеснік старшыні савета БФК, адзначыў, што вельмі важна падкрэсліць значэнне старажытнага горада Полацка — як калыскі беларускай дзяржаўнасці. Тадэуш Стружэцкі, таксама намеснік старшыні рады, расказаў, што ў гэтым годзе павінна пачацца праца па пераўтварэнні вёскі Будслаў у цэнтр турызму і культуры. Сярод прапаноў фонду на 2017 год — наданне імя Францішка Скарыны Нацыянальный бібліятэцы Беларусі і адкрыццё мемарыяльнага знака «Беларусам свету».

**Яна ПАЛЯШЧУК**